Алесь СУША,
кандыдат культуралогіі,
намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ – ЗБІРАЛЬНІЦА СКАРБАЎ АЙЧЫННАГА ПІСЬМЕНСТВА

Бібліятэкі Беларусі выконваюць высакародную місію захавання нацыянальнай кніжнай спадчыны на працягу многіх стагоддзяў, за што яны заслужылі права называцца скарбніцамі ведаў, скарбніцамі культуры. Найважнейшую ролю ў захаванні кніжнай спадчыны краіны на працягу ўжо ста гадоў выконвае Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Сёння яна – найбуйнейшая бібліятэка нашай дзяржавы, важны інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр, нацыянальнае кнігасховішча, дзе сканцэнтраваны самы вялікі ў краіне ўніверсальны фонд выданняў і помнікаў пісьменства, каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры. Сёння ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зберагаецца больш за 10 мільёнаў дакументаў, сярод якіх асобнае месца належыць 100-тысячнаму збору рукапісаў, старадрукаваных і рэдкіх выданняў, а таксама паўмільённай калекцыі нацыянальнага дакумента і беларусікі.

Фарміраванне збору пачалося адразу пасля ўзнікнення самой бібліятэкі. Асноўнай крыніцай атрымання рэдкіх і каштоўных кніг сталі закрытыя манастырскія і царкоўныя бібліятэкі, бібліятэкі навучальных устаноў, прыватныя калекцыі [1, с. 28–29]. Сярод іншага Дзяржаўная бібліятэка БССР (такая была ў той час назва) атрымала частку кнігазбору барысаўскага калекцыянера І. Каладзеева па гісторыі вайны 1812 г. і бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі. Ёй былі перададзены кнігазборы Мінскай і Віцебскай духоўных семінарый, Слуцкай, Мінскай, Магілёўскай гімназій. Былі набыты калекцыі вядомых беларускіх вучоных і даследчыкаў Я. Карскага, К. Случэўскага, Е. Раманава, М. Янчука, П. Жуковіча, Я. Дылы, А. Сапунова, бібліяфілаў В. Камарніцкага, С. Гальдштэйна і інш. У першыя гады існавання бібліятэкі камплектаванне дарэвалюцыйнай літаратурай вялося таксама шляхам перадачы кніг з Дзяржаўнага кніжнага фонду. Гэтым шляхам з Масквы і Ленінграда з 1923 да 1932 г. было атрымана больш за 270 тыс. тамоў [2, с. 5].

У часы Вялікай Айчыннай вайны амаль увесь фонд бібліятэкі быў вывезены фашысцкімі войскамі за межы Беларусі, часткова знішчаны: з двух мільёнаў адзінак засталося каля 320 тыс. У значнай ступені былі страчаны менавіта каштоўныя дакументальныя помнікі.

Аднаўленне фондаў пачалося адразу пасля вызвалення Мінска. Частка страчанага была адшукана ў Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі – было вернута каля 700 тыс. кніг даваеннага фонду. Прыкладна 1 мільён кніг не знойдзены і да гэтага часу, сярод іх – значная частка рукапісаў і старадрукаў.

Дзякуючы руплівасці супрацоўнікаў бібліятэкі яе фонды хутка аднавіліся ў колькасных паказчыках да даваеннага ўзроўню, аднак запоўніць страты і лакуны ў рэпертуары нацыянальнага дакумента, вярнуць каштоўныя кніжныя рарытэты ў поўнай меры не атрымалася і дагэтуль.

Вынікам шматгадовай працы стала фарміраванне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі най-



**Рукапіснае Евангелле XVI ст.**

багацейшага ў краіне збору кніжных помнікаў нацыянальнага і міжнароднага значэння. Гэта рукапісныя кнігі і архіўныя матэрыялы, частка Нацыянальнага архіўнага фонду Беларусі, старадрукі і рэдкія выданні XIX–XXI стст.

Унікальнасцю вылучаецца калекцыя рукапісаў і архіўных матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая налічвае больш за 10 тыс. адзінак захоўвання. Самыя раннія помнікі датуюцца XIV ст. У складзе калекцыі – вядомы рукапіс XVI ст. "Тайная тайных, або Арыстоцелевы вароты" на старабеларускай мове, беларускія рукапісы рэлігійнага зместу, разнастайныя помнікі мастацкага характару і дакументы гаспадарчага прызначэння і інш.

Гістарычны шлях Беларусі абумовіў характар культурных працэсаў у нашай краіне. Так, пражыванне на беларускіх землях вялікай колькасці прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей выявілася ў незвычайнай разнастайнасці айчыннай кніжнай культуры. Кніжныя помнікі на беларускіх землях ствараліся на самых розных мовах: старабеларускай, сучаснай беларускай, царкоўнаславянскай, рускай, польскай, нямецкай, французскай, лацінскай, італьянскай, а таксама іўрыце, ідыш і іншых мовах. Што характэрна, рукапісныя помнікі на беларускай мове ствараліся ў розных графічных сістэмах. Так, апрача вялікай колькасці беларускамоўных рукапісаў, запісаных кірыліцай, у зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зберагаецца нямала дакументаў, напісаных лацінскім шрыфтам і нават арабскім алфавітам. Сярод апошніх найярчэйшых знаходак – раней не вядомыя спісы "Прамовы Мялешкі" і "Ліста да Абуховіча", напісаныя па-беларуску лацінкай [3, с. 62–88]. Вялікую цікавасць мае калекцыя кітабаў – свяшчэнных кніг беларускіх татараў, якія пісаліся па-беларуску і па-польску арабскім пісьмом [4].

Надзвычай цікавыя рукапісныя кнігі, што ўзніклі ў царкоўным асяроддзі і прызначаліся для ўжывання ў храмах, манастырах, духоўных навучальных установах. Сярод іх шматлікія Евангеллі, пролагі, служэбнікі, жыціі святых, зборнікі слоў, павучанняў, казанняў і інш. Разнастайнасць помнікаў сведчыць пра багацце духоўнага жыцця даўняй Беларусі, пра поліканфесійнасць беларускай культуры.

Для нашай культуры найбольшую каштоўнасць маюць кірылічныя рукапісныя кнігі, што былі напісаны беларускім пісьмом ці ствараліся на беларускіх землях. Самыя старэйшыя з іх: Мінея (сяр. XV ст.), Пролаг (пач. XVI ст.), Евангелле-апракас (пач. XVI ст.), Трэфалогій (XVI ст.), Актоіх (сяр. XVI ст.), Шасціднёвік Іаана Златавуста (пач. XVII ст.) [1, с. 29; 5, с. 115–121]. Цікавай з'явай айчыннай кніжнай культуры можна назваць кнігапісную традыцыю беларускіх старавераў, якія стварылі вялікі пласт яркіх паводле афармлення рукапісных кніг.

Навуковая і вучэбная літаратура па філасофіі, багаслоўі, медыцыне, прыродазнаўстве прадстаўлена пераважна рукапісамі на лацінскай мове, а таксама ў пэўнай ступені – на нямецкай і французскай мовах. Сярод дакументаў на французскай мове найбольш цікавыя ўнікальныя рукапісы (у тым ліку дзённікі і мемуары) французскіх салдат і афіцэраў – удзельнікаў напалеонаўскіх войнаў 1800–1815 гг. [6, с. 242–244].

Фонд архіўных матэрыялаў уключае асабістыя фонды пісьменніка і мастака Каруся Каганца, бібліятэказнаўцы і бібліёграфа, арганізатара і першага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Іосіфа Сіманоўскага, бібліятэказнаўцы і бібліёграфа Яўгена Хлябцэвіча, гісторыка-ўсходазнаўцы Мікалая Нікольскага, бібліёграфаў і літаратуразнаўцаў Ніны Ватацы і Валянціны Дышыневіч [1, с. 29]. Вялікую цікавасць мае збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі, куды ўваходзяць творчыя рукапісы Цішкі Гартнага, Змітрака Бядулі, Якуба Коласа і інш. Бібліятэка зберагае таксама рукапісы неапублікаваных навуковых твораў першага рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзіміра Пічэты.

Рукапісныя і архіўныя дакументы са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – важныя



**“Тайная тайных, або Арыстоцелевы вароты”. Беларускі рукапіс.**
Канец XV – пачатак XVI ст.

крыніцы айчыннай гісторыі. Напрыклад, шэраг дакументаў быў створаны ў значны перыяд нашага мінулага – напрыканцы XVI ст. Сярод іх – выпіскі з архіва Мінскага гарадскога суда, пастановы і дэкрэты Трыбунала ВКЛ, каралеўскія прывілеі і граматы, лісты прыватных асоб і інш. На некаторых дакументах захаваліся аўтографы і пячаткі вядомых гістарычных дзеячаў. Нямала звестак па айчыннай генеалогіі таксама можа быць пачэрпнута з рукапісных крыніц бібліятэкі: пастаноў розных органаў дзяржаўнага і мясцовага кіравання, метрычных кніг касцёлаў і цэркваў (у Быхаве, Камаях, Магілёве, Мазыры, Самахвалавічах, Новым Свержні і г. д.), сінодзікаў манастыроў (напрыклад, Куцеінскага) і іншых дакументаў. Гаспадарча-эканамічнае жыццё даўняй Беларусі зафіксавана ў шматлікіх афіцыйных нарматыўных дакументах, справаздачах і апісаннях, інвентарах храмаў і манастыроў і г. д.

Фотадакументы са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі таксама ўяўляюць выключную цікавасць і каштоўнасць. Напрыклад, безумоўнае значэнне мае фотаальбом, прысвечаны паляўніцтву і зроблены ў Нясвіжскім замку і наваколлі Клецка ў 30-я гады XX ст. На здымках прадстаўнікі знакамітага роду Радзівілаў і іх шматлікія госці, экзатычныя паляўнічыя і не менш экзатычныя трафеі, сюжэты паляўнічага жыцця, віды наваколля, а таксама выгляд пакояў замка ў Нясвіжы [1, с. 32].

Нацыянальная бібліятэка Беларусі зберагае найбольшую ў краіне калекцыю старадрукаваных выданняў, г. зн. апублікаваных да 1800 г., – каля 30 тыс. асобнікаў. Сярод іншага бібліятэка валодае адзінай у краіне калекцыяй выданняў беларускага і ўсходнееўрапейскага першадрукара Францыска Скарыны – 10 выпускаў (у шасці пераплётах) кніг Бібліі (Прага, 1517–1519). Вялікую каштоўнасць маюць таксама выданні паслядоўнікаў і пераемнікаў Францыска Скарыны.

Асаблівай мастацкай прывабнасцю альбо рэдкасцю вылучаюцца “Псалтыр” Пятра Мсціслаўца (Вільня, 1576), “Евангелле вучыцельнае” Васіля Гарабурды (Вільня, каля 1580), шматлікія выданні братоў Мамонічаў, а таксама пазнейшыя выданні беларускіх друкарань у Еўі, Куцейне, Магілёве, Супраслі, Гродне. Важна, што выдавецкая прадукцыя фактычна ўсіх друкарань, што выпускалі кірылічную кнігу, прадстаўлена ў зборах Нацыянальнай бібліятэкі [7]. Калекцыя беларускіх кірылічных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сёння налічвае 300 выданняў.

У збор беларускіх кніг, надрукаваных лацінскім шрыфтам у XVI–XVIII стст., уваходзяць унікальныя асобнікі: кнігі з брэсцкай друкарні Мікалая Радзівіла Чорнага, сталічных друкарань у Вільні, а таксама Ашмянскай, Нясвіжскай, Пінскай, Полацкай, Слуцкай, Супрасльскай і іншых беларускіх друкарань. Да нядаўняга часу гэтым выданням не аддавалася адпаведнай увагі з боку даследчыкаў і дзяржаўных бібліятэк Беларусі, у выніку чаго яны лічацца найбольш рэдкімі і малавывучанымі. Па-першае, яны горш за іншыя захаваліся і абсалютная іх большасць знаходзіцца па-за межамі краіны, па-другое, значная іх частка яшчэ патрабуе свайго выяўлення: старадрукі на замежных мовах у бібліятэках і музеях з-за адсутнасці спецыялістаў з добрым веданнем моў апрацоўваліся ў апошнюю чаргу (калі ўвогуле апрацоўваліся) [8, с. 62–68].

Як прыклад можна назваць друкарню ў Ашмяне Мураванай, дзейнасць якой пацвярджаецца існаваннем толькі аднаго дагэтуль выяўленага выдання з яе – шэсць палемічных кніг (частак аднаго выдання) мясцовага казнадзея евангеліка Войцеха Салінарыуса пад назвай “Цэнзура”. У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца канвалют з першых трох кніг “Цэнзуры”, якія сабраны ў адзін пераплёт, што, верагодна, мае мясцовае паходжанне.

Над афармленнем беларускай старадрукаванай кнігі працавалі цудоўныя майстры-гравёры. Сярод іх вылучаюцца імёны Аляксандра Тарасевіча (шэдэўрам беларускай кніжнай гравюры




**“Літургікон, або Служэбнік” з гравіраваным тытульным аркушам.** Вільня – Супрасль. 1692–1695 гг.

можна лічыць яго афармленне кнігі “Разарыум”, Вільня, 1678), Лявонція Тарасевіча (асабліва вылучаецца афармленне “Служэбніка”, Вільня – Супрасль, 1692–1695), Тамаша Макоўскага (“Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую Зямлю” М. К. Радзівіла, Брунсберг, 1601; “Гіпіка” К. М. Дарагастайскага, Кракаў, 1603, 1647), Максіма Вашчанкі (“Турэцкая манархія”, Слуцк, 1678), Васіля Вашчанкі (“Неба новае”, Магілёў, 1699; “Пярло вельмі каштоўнае”, Магілёў, 1699), Фёдара Ангілейкі (“Трыфалагіён”, Магілёў, 1748), Гірша Ляйбовіча (альбом гравіраваных партрэтаў Радзівілаў “Icones familiae ducalis Radiviliane”, Нясвіж, 1758) і інш. Дзякуючы іх працы беларуская кніжная графіка была ўпісана ў еўрапейскі кантэкст і сёння лічыцца адным з найвышэйшых дасягненняў айчыннай культуры таго часу.

Адна з характэрных асаблівасцей беларускага кнігадрукавання – разгалінаваная сетка выдавецкіх цэнтраў, якія знаходзіліся па ўсёй тэрыторыі Беларусі. А таксама стварэнне друкарань духоўнымі цэнтрамі (брацтвамі і манастырамі), навучальнымі ўстановамі (напрыклад, Полацкай акадэміяй), прадстаўнікамі заможных шляхецкіх родаў і купцамі (напрыклад, Радзівіламі і Мамонічамі), існаванне так званых каралеўскіх друкарань.

У адрозненне ад большасці еўрапейскіх краін для кніжнай культуры Беларусі XVI–XVIII стст. характэрная наяўнасць друкарань рознай канфесійнай прыналежнасці, якія канкурыравалі між сабою, імкнучыся прывабіць чытача асартыментам і афармленнем сваёй прадукцыі. Так, у Беларусі існавалі шматлікія праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія і пратэстанцкія друкарні, чыя выдавецкая прадукцыя прадстаўлена ў зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Апрача асобных кніжных помнікаў у зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захоўваюцца фрагменты гістарычных кнігазбораў беларускага паходжання, якія таксама маюць надзвычайную каштоўнасць як комплексныя помнікі кніжнай спадчыны Беларусі.

На вялікі жаль, ад колішняга вялікага багацця прыватных, манастырскіх, царкоўных, грамадскіх, вучэбных, публічных бібліятэк Беларусі, створаных да XX ст., засталіся толькі фрагменты. Цэльных кнігазбораў да сённяшняга часу не захавалася. Характэрнай асаблівасцю трэба назваць і тую акалічнасць, што большасць даўніх кніжных калекцый (з тых, што захаваліся) сёння знаходзіцца па-за межамі нашай краіны – пераважна ў Расіі, Літве, Польшчы і Украіне. Гэта тычыцца, напрыклад, прыватных бібліятэк Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Гутэн-Чапскіх і інш. Толькі рэдкія асобнікі з гістарычных калекцый сёння можна бачыць у нашых фондах. Да таго ж у Беларусі сістэматычна і мэтанакіравана вывучэннем гістарычных кнігазбораў да нядаўняга часу амаль не займаліся. Горш за ўсё тое, што вельмі дрэнна вывучана асноўная крыніца – самі фонды, што захаваліся. Яшчэ адна праблема – разгрупаванне, распыленне калекцый як унутры фондаў асобных сучасных бібліятэк, так і паміж імі. Пры ўвядзенні гістарычнага кнігазбору ў фонд часта не ўлічваўся прынцып калекцыйнасці: найбольш каштоўныя выданні, як правіла, канцэнтраваліся ў аддзеле рэдкай кнігі, астатнія перадаваліся ў агульнае кнігасховішча і размяшчаліся ў адзіным інвентарным радзе [9, с. 28–39].

Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі вывучэнне гістарычных кнігазбораў стала адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці беларускіх бібліятэк, у тым ліку і нацыянальнай. Вывучэнне і рэканструкцыя асобных з іх увайшлі нават у спіс найважнейшых задач Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2011–2015 гг. З мэтай абагульнення вынікаў навуковых даследаванняў у 2018 г. бібліятэка падрыхтавала і выдала зборнік даследаванняў “Рэха беларускіх кнігазбораў: лёсы прыватных бібліятэк” [10], а таксама быў праведзены шэраг канферэнцый, круглых сталоў, выстаў і творчых сустрэч.

У выніку інтэнсіўнай працы апошніх гадоў у зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вы-

яўлены шматлікія дакументальныя помнікі, якія некалі захоўваліся ў зборах беларускіх манастыроў і храмаў (у Баркулабаве, Будславе, Быхаве, Куцейне, Лядах, Мінску, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Полацку, Чарэі і інш.), навучальных устаноў (Полацкай акадэміі, езуіцкіх калегій, семінарый і школ базыльян, канвентаў дамінікан, разнастайных гімназій, школ і вучэльняў з усёй Беларусі), навуковых, грамадскіх і іншых арганізацый.



**Ноталінейны ірмалой. Беларускі рукапіс.** 1778 г.

Як самастойныя калекцыі зберагаюцца кнігазборы трох вучоных-славістаў Яўхіма Карскага, Мікалая Янчука і Канстанціна Грота. Усе астатнія прыватныя кніжныя калекцыі захоўваюцца ў размеркаваным выглядзе. Сярод іх кнігазборы Радзівілаў, Слізняў, Паскевічаў, Георгія Каніскага, Аляксея Сапунова, Платона Жуковіча, Івана Каладзеева, Івана Карнілава, Браніслава Эпімаха-Шыпілы, Аляксандра Ельскага, Мітрафана Доўнара-Запольскага, Уладзіміра Пічэты, Міколы Каспяровіча, Вацлава Ластоўскага, Янкі Купалы, Цішкі Гартнага, Язэпа Дылы і многіх іншых.

Вялікую групу ствараюць так званыя рэдкія выданні. Крытэрыі вызначэння рэдкасці выданняў фармалізаваць даволі складана. Аўтары энцыклапеды “Кніга” (1998) тэрмін “рэдкая кніга” разглядаюць, «па-першае, як выданне, якое захавалася ў адносна малой колькасці экзэмпляраў і якое мае пэўную каштоўнасць – грамадска-палітычную, ідэйна-эстэтычную, навуковую, мастацка-паліграфічную, гісторыка-бытавую, мемуарную, краязнаўчую, бібліяграфічную і г. д.; па-другое, як экзэмпляр выдання, які мае непаўторныя прыметы, што адрозніваюць яго ад астатняга тыражу выдання – імянны, размаляваны ад рукі, з аўтографам пісьменніка, паметамі чытача, цікавым у гістарычных ці мемуарных адносінах экслібрысам, асабліва пераплецены і г. д. Сінонімамі тэрміна “рэдкая кніга” выступаюць паняцці “бібліяграфічная рэдкасць”, “рарытэт”, “унікальная кніга”» [11, с. 525].

Для ідэнтыфікацыі кніжных помнікаў, іх калекцый і фондаў як каштоўных аб’ектаў культурнай спадчыны ўжываюцца храналагічныя, сацыяльна-каштоўнасныя і колькасныя крытэрыі.

Храналагічныя крытэрыі: старадаўнасць аб’екта, якая вызначаецца працягласцю часавага інтэрвалу паміж датай стварэння аб’екта і сучасным момантам, і этапнасць, яна характарызуе аб’ект, што дакументуе пераломны этап грамадскага развіцця і адначасова з’яўляецца неад’емнай яго часткай.

Сацыяльна-каштоўнасныя крытэрыі: адметныя вартасці, якія ўласцівы аб’екту як рэчыўнаму выніку матэрыяльнай культуры (своеасаблівасць матэрыяльнага ўвасаблення кніжнага помніка, яго адметная форма, мастацкае, графічнае або кампазіцыйнае вырашэнне, надзвычайнасць самога факта з’яўлення аб’екта) і функцыянальныя прыметы, што былі набыты аб’ектам у працэсе яго існавання.

Функцыянальнымі прыметамі каштоўнасці лічацца прыярытэтнасць, мемарыяльнасць і ўнікальнасць помніка. Прыярытэтнасць характарызуе аб’ект як першадрук твораў выдатных грамадскіх і палітычных дзеячаў, класікаў навукі і культуры, іншых твораў, якія маюць прынцыповую значнасць для гісторыі, навукі, культуры; як першыя ўзоры рознай тэхнікі друку і кніжнага афармлення. Мемарыяльнасць аб’екта вызначае яго сувязь з жыццём і працай выдатных асоб, дзеячаў дзяржавы, навукі, культуры, з працай навуковых і творчых калектываў, а таксама з важнымі гістарычнымі падзеямі. Унікальнасць вызначае дакумент як адзіны ў сваім родзе, з індывідуальнымі асаблівасцямі, якія маюць гісторыка-культурнае і навуковае значэнне.

Колькасныя крытэрыі – малараспаўсюджанасць і рэдкасць аб’екта. Малараспаўсюджаныя аб’екты – такія, якія былі створаны ў невялікай колькасці асобнікаў або ўсе асобнікі якіх у сувязі з нейкімі гістарычнымі абставінамі сканцэнтраваны ў межах невялікай тэрыторыі ці ў вузкага кола ўладальнікаў. Рэдкасць характарызуе

аб'ект, які захаваўся ў адносна малой колькасці асобнікаў [12, с. 20–21].

У адпаведнасці з гэтымі крытэрыямі ў зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вылучана вялікая, найбольшая ў краіне калекцыя рэдкіх і каштоўных дакументаў. Так, напрыклад, за працяглае існаванне кнігі набываюць адметнасць і непаўторнасць дзякуючы іх афармленню ў каштоўны пераплёт ці з'яўленню экслібрысаў і пячатак, уладальніцкіх і чытацкіх пазнак і нататак, якія становяцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння айчыннай гісторыі і культуры. А ў даўніх зборах бібліятэкі што ні кніга – то помнік, то свой лёс. Асаблівае месца сярод каштоўных збораў Нацыянальнай бібліятэкі займаюць сотні і сотні кніг з аўтографамі беларускіх і замежных аўтараў. Поруч з кнігамі, на якіх захаваліся аўтографы знакамітых дзеячаў сусветнай культуры – Мікалая Гогаля і Івана Буніна, Анатоля Франса і Віктора Гюго, Сальвадора Далі і Пабла Пікасо, Марыны Цвятаевай і Аляксея Рэмізава, – знаходзяцца кнігі з уласнаручнымі запісамі айчынных дзеячаў – Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Марка Шагала і многіх іншых.

Апрача таго, да рэдкіх і каштоўных выданняў трэба далучыць таксама багатыя зборы выданняў на беларускай мове (кірылічным і лацінскім шрыфтам), надрукаваныя ў Беларусі і за яе межамі да 1917 г.; на рускай і іншых мовах, выдадзеныя ў Беларусі да 1917 г. (у адпаведнасці з паказанымі крытэрыямі рэдкасці). Вялікую групу складаюць таксама многія выданні да 1917 г., што датычацца Беларусі і сумежных з ёй тэрыторый, якія культурай і гісторыяй звязаны з Беларуссю.

Асобна варта вылучыць публікацыі, што адлюстроўваюць падзеі і эпохі вялікай гістарычнай значнасці: рэвалюцый 1905–1907 гг. і 1917 г., грамадзянскай вайны і першых гадоў Савецкай улады 1917–1921 гг., Першай і Другой сусветных войнаў.

Крытэрыям рэдкасці таксама адпавядаюць выдадзеныя да 1917 г. першыя і прыжыццёвыя выданні твораў выдатных беларускіх і замежных грамадскіх дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў; нелегальныя, забароненыя і канфіскаваныя выданні на беларускай, рускай і замежных мовах, якія выходзілі на тэрыторыі Расійскай імперыі або па цэнзурных умовах выдаваліся за мяжой; выданні беларускага, рускага і ўкраінскага замежжа (1901–1941); непадцэнзурны друк Беларусі XX ст.; узоры выданняў вядомых выдавецтваў; узоры найлепшых серыйных выданняў ("Заглянє сонца і ў наша ваконца"); выданні, паказальныя ў паліграфічных адносінах (арыгінальны спосаб друку, шрыфт, матэрыял, кніжнае аздабленне і г. д., у т. л. кнігі беларускіх выдавецтваў, што атрымалі міжнародныя або нацыянальныя прэміі за паліграфічнае выкананне); кнігі, ілюстраваныя выдатнымі мастакамі (найлепшыя выданні), з ілюстрацыямі, падпісанымі мастаком ці гравёрам, размаляванымі або праўленымі ад рукі; асобнікі выданняў у асабліва каштоўных, мастацкіх, зробленых з рэдкіх матэрыялаў або падпісных пераплётах; работы вядомых майстэрань або майстроў пераплётнай справы; бібліяфільскія выданні, прызначаныя для калекцыянераў; кнігі і перыядычныя выданні, выпушчаныя абмежаваным тыражом (за выключэннем тых выданняў XX–XXI стст., малатыражнасць якіх абумоўлена вузкасцю рынку збыту, ведамасных выданняў); экзэмпляры з рознымі ўкладкамі, цэнзурнымі праўкамі, рукапіснымі прышыткамі; кнігі незвычайных фарматаў і формаў; мініяцюрныя выданні з гранічнымі памерамі менш за 100 × 100 *мм* па абрэзе тытульнага аркуша.

Калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі фактычна бязмежныя па сваіх багаццях помнікаў кніжнай спадчыны беларускага паходжання. Вельмі важна, што праца па выяўленні, уліку, апісанні, набыцці, захоўванні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Беларусі працягваецца і сёння. У апошні час бібліятэка набывае кніжныя помнікі ў букіністычных крамах і ў прыватных асоб, а таксама ў археаграфічных экспедыцыях, атрымлівае каштоўныя кнігі ў дар.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі вядзе пастаянную і мэтанакіраваную працу аднаўлення калекцыі згубленых у гады Вялікай Айчыннай вайны нацыянальных дакументаў. Неацэнную дапамогу ў выяўленні і вяртанні выданняў – часткі культурнай спадчыны нашага народа – робяць замежныя партнёры: нацыянальныя і ўніверсітэцкія бібліятэкі, прадстаўнікі беларускай дыяспары ў свеце, дыпламатычныя прадстаўніцтвы нашай краіны. Напрыклад, у 2021 г. пры падтрымцы беларускай дыяспары ў Расіі і Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў зборы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі быў перададзены каштоўны асобнік першага выдання Сімяона Полацкага "Посах кіравання" (Масква, 1667).

Найбольш дарагія выданні набыты за мэтавыя дзяржаўныя сродкі і пры фінансавай падтрымцы беларускіх і замежных устаноў і арганізацый. Дзякуючы сродкам, атрыманым бібліятэкай праз гранты з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, яе фонды папоўніліся ўнікальнымі картамі: "Magni Dvcatvs Lithvaniae Caeterarvmqve Regio" (карта Радзівіла з атласа "Willem Janszoon Blaeu 1631–1670", створаная ў 1640-я гг.), "Lectoris Hunc Borysthenis Tractum um ad Nostram Geographiae…" (з тых жа атласаў 1631–1670 гг., карта парогаў Дняпра), "Lithvania" (карта з атласа Меркатара "Atlas sive cosmographiae…", Duisburg, 1595 або 1602), "Vera designatio vrbis in Littavia Grodnae" (выява Грод-

на, экзэмпляр, размаляваны ад рукі; знакамітая гравюра з выявай горада Гродна), прыжыццёвае выданне Мялеція Сматрыцкага.

Іншы кірунак працы ў набыцці каштоўных кніг для фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – дзяржаўна-прыватнае партнёрства і падтрымка спонсараў. Так, пры падтрымцы партнёраў бібліятэкі на замежных аўкцыёнах і ў антыкварных крамах выкуплены і перададзены ў зборы бібліятэкі “Псалтыр” (Вільня, 1782), “Жыцці святых” Д. Растоўскага (Магілёў, 1702), чатыры выданні знакамітай працы айчыннага вучонага сусветнага ўзроўню Казіміра Семяновіча “Вялікае мастацтва артылерыі” (на лацінскай мове – 1650 г., на французскай – 1651 г., на нямецкай – 1676 і на англійскай – 1729 г.), выданні беларускіх друкарань XVII–XVIII стст.

У сітуацыі немагчымасці хуткага вяртання ў Беларусь многіх рарытэтных выданняў і старажытных рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі праводзілася актыўная праца па атрыманні іх электронных копій з замежных збораў. Напрыклад, былі атрыманы лічбавыя копіі большасці вядомых сёння асобнікаў выданняў Францыска Скарыны з Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Расіі, Славеніі, Украіны і інш.

Вельмі важным напрамкам дзейнасці стала факсімільнае ўзнаўленне кніжных помнікаў, арыгіналы некаторых з якіх у Беларусі адсутнічаюць ці мала даступны шырокай аўдыторыі. Так, у Беларусь у выглядзе факсімільных узнаўленняў атрымалася вярнуць самыя старажытныя і каштоўныя кніжныя помнікі нашай краіны: Тураўскае, Полацкае, Слуцкае і Жыровіцкае Евангеллі, Баркалабаўскі летапіс, Віленскі буквар 1767 г., прыжыццёвыя выданні Янкі Купалы і Якуба Коласа, многія іншыя знакавыя творы пісьменства і друку. Найважнейшым выданнем, прымеркаваным да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, стаў выпуск факсімільнага ўзнаўлення кніжнай спадчыны Скарыны. У 2018 г. да 400-годдзя выдання першага ў свеце “Буквара” А. Сушам было падрыхтавана факсімільнае выданне гэтай кнігі. У 2019 г. да 1000-годдзя Брэста быў узноўлены сапраўдны шэдэўр кніжнай культуры Беларусі – Берасцейская Біблія.

З мэтай уліку і папулярызацыі кніжнай спадчыны, што зберагаецца ў нашай краіне, Нацыянальная бібліятэка Беларусі пачынаючы з нядаўняга часу займаецца стварэннем і вядзеннем Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь, штогод ладзіць Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, выдае штогадовы навуковы зборнік “Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі”.

Зборы бібліятэкі паказваюць багацце і разнастайнасць кніжнай спадчыны Беларусі, што з’яўляецца сведчаннем плённай стваральнай дзейнасці нашых папярэднікаў, высокага развіцця культуры Беларусі яшчэ ў часы старажытнасці, а таксама цесных сувязей жыхароў нашай краіны з іншымі народамі і культурамі. Кніжныя помнікі зберaглі для нас усё тое, пра што думалі і марылі нашы папярэднікі, што яны імкнуліся перадаць нашчадкам.

### Спіс літаратуры

1. **Станкевіч, Л. І.** Рукапісны фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як крыніца гісторыі Беларусі / Л. І. Станкевіч // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. – Мінск, 1997. – Вып. 2.

2. **Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі** : фотаальбом. – Мінск : НББ, 2005.

3. **Віцько, Д. В.** Silva rerum Стафана Яна Слізня XVII–XVIII стст. з успамінамі Аляксандра Слізня за 1561–1649 гг. : (са збору Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) / Д. В. Віцько // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. – Мінск, 2009. – Вып. 11.

4. **Несцяровіч, В. І.** Старажытныя рукапісы беларускіх татар: Графіка. Транслітарацыя. Агул. характарыстыка мовы. Фразеалогія / В. І. Несцяровіч. – Віцебск : Выд-ва ВДУ, 2003. – 104 с.; **Рукапісы татараў Беларусі** канца XVII – пачатку XX ст. з дзяржаўных кнігазбораў краіны : каталог / [склад. : М. У. Тарэлка, А. І. Цітавец]. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 221 с.

5. **Лаўрык, Ю. М.** Куцеінская мінея са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: да праблемы ўдакладнення атрыбуцыі / Ю. М. Лаўрык // Матер. VI Междунар. книговед. чтений “Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса”, Минск, 27–29 окт. 2010 г. – Минск, 2010. – С. 115–121.

6. **Сцебурака, А. М.** Агляд калекцыі французскіх рукапісаў аб Напалеонаўскіх войнах у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / А. М. Сцебурака // Библиотеки в информационном пространстве: синтез традиций и инноваций : матер. Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 12 сент. 2007 г. – Минск, 2007.

7. **Киреева, Г. В.** Коллекция белорусских кириллических книг XVI–XVII веков в Национальной библиотеке Беларуси / Г. В. Киреева // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. – Мінск, 1997. – Вып. 2. – С. 80–105; **Кніга Беларусі** (1517–1917) = Книга Белоруссии (1517–1917) : зводны каталог / Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна, БелСЭ ; [склад. : Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч]. – Мінск : БСЭ, 1986. – 614 с.

8. **Рошчына, Т. І.** Ашмянскія стaрадрукі ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі // Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства : Матэр. III Міжнар. кангр. беларусістаў “Бел. культура ў дыялогу цывілізацый”, 1-я сес. – 21–25 мая, 2-я сес. – 24–27 снеж. 2000 г., Мінск / рэдкал. : У. Конан (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001.

9. **Рошчына, Т. І.** Памяць Беларусі: Вынікі, праблемы і перспектывы даследавання кніжнай спадчыны / Т. І. Рошчына // Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на мяжы стагоддзяў : зб. навук. прац / [склад. Л. Г. Кірухіна]. – Мінск, 2002.

10. **Рэха беларускіх кнігазбораў**: Лёсы прыватных бібліятэк : зборнік артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск : Нац. біб-ка Беларусі, 2018. – 351 с.

11. **Книга** : энциклопедия / Всерос. кн. Палата ; гл. ред. В. М. Жарков. – М. : Большая рос. энцикл., 1999.

12. **Верас, Н. Я.** Тэрмін “бібліяграфічная рэдкасць” адносна беларускай рэдкай кнігі: да пастаноўкі пытання / Н. Я. Верас // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 9.